3 Брадзіхіна, А. В. Методыка выкладання беларускай літаратуры: вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская), 6-05 0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская), 6-05-0232-01 Беларуская філалогія (па напрамках). Прафілізацыя: літаратурана-рэдакцыйная дзейнасць [Электронны рэсурс] / А. В. Брадзіхіна; М-ва адукацыі РБ; Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2012. – Рэжым доступу : https://dot3.gsu.by/course/view.php?id=5849. – Дата доступу : 15.04.2024.

4 Арочка, М. М. Рыгор Барадулін / М. М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / навук. рэд. У. В. Гніламёдаў [і інш.] / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. ім. Я. Купалы. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – Т. 4, кн. 1: 1966–1985. – С. 594–620.

5 Бельскі, А. І. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі, Л. К. Цітова. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – 240 с.

**УДК 37.091.33-028.22:37.015.31:811.161.3:821.161.3**

***В. А. Сцепчанка***

# ВЫКАРЫСТАННЕ ПРЫЁМУ “ВОБЛАКА СЛОЎ” НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

*У дадзеным артыкуле разглядаецца пытанне актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў шляхам выкарыстання візуалізацыі на ўроках беларускай мовы і літаратуры на прыкладзе выкарыстання такога прыёму, як “воблака слоў”, прадстаўляецца апісанне дадзенага прыёму і разглядаюцца прыклады і ідэі прымянення “воблака слоў” пры вывучэнні розных тэм.*

Дваццаць першае стагоддзе характарызуецца хуткім развіццём усіх сфер жыцця, у тым ліку і сферы адукацыі. Менавіта хуткае развіццё тэхналогій патрабуе распрацоўкі новых методык выкладання беларускай мовы і літаратуры і мадэрнізацыі тых, якія ўжо існуюць. Акрамя гэтага, пры распрацоўцы новых форм урока трэба улічваць псіхалагічны стан сучасных вучняў, іх інтарэсы і захапленні. Без уліку гэтых асаблівасцей немагчыма распрацаваць якасны ўрок, зацікавіць школьнікаў і стварыць умовы для разумення і запамінання матэрыялу.

Варта адзначыць і тое, што працэс навучання не павінен зводзіцца толькі да засваення і завучвання правіл, прадстаўленых настаўнікам, але і мець творчы характар. “Навучанне – гэта актыўны творчы пошук з боку настаўніка і з боку вучня” [1]. Такім чынам, галоўная задача настаўніка – сфарміраваць працэс перадачы ведаў такім чынам, каб вучні авалодалі навыкам актыўнага навучання і здольнасцю самастойна здабываць веды.

Праблема навуковасці, даступнасці, свядомасці і актыўнасці ставіць перад настаўнікам задачу выяўлення практычным шляхам актыўных метадаў фарміравання і арганізацыі вучэбнай пазнавальнай дзейнасці. Візуалізацыя працэсу навучання становіцца адным са шляхоў вырашэння дадзенай праблемы. Візуалізацыя (ад лац. visualis “глядзець”) – гэта “метад прадстаўлення інфармацыі, фізічных і сацыяльных працэсаў і з’яў, падзей ў выглядзе, зручным для назірання і аналізу – у выглядзе аптычнага малюнка (напрыклад, у выглядзе малюнкаў і фатаграфій, графікаў, дыяграм, структурных схем, табліц, карт і г. д.)” [2].

Пазнавальная дзейнасць вучняў мае вялікае значэнне для фарміравання асобы школьніка і яго агульнага развіцця. Увогуле, пры развіцці пазнавальных інтарэсаў вучняў вельмі важна сфарміраваць накіраванасць на працэс, у ходзе якога адбываецца набыццё розных уменняў і навыкаў, развіццё асобаснага мыслення ў адпаведнасці з патрэбамі сучаснага грамадства, вырашэннем задач навукова-тэхнічнага прагрэсу і развіццём духоўных каштоўнасцей. У сувязі з тым, што пазнавальная дзейнасць школьнікаў з'яўляецца неад'емнай характарыстыкай іх навучальнай дзейнасці, лагічна ўзнікае праблема пошуку розных шляхоў павышэння актыўнасці дадзенай дзейнасці. Працэс нагляднага навучання дазваляе настаўніку авалодаць актыўнымі метадамі навучання і выхавання, садзейнічае забеспячэнню прынцыпаў навуковасці і даступнасці выкладу матэрыялу, паляпшэнню агульнай падрыхтоўкі школьнікаў, дазваляе падтрымліваць цікавасць вучняў да прадмета і вучобы наогул, прыводзіць да больш высокага ўзроўню развіцця лагічнага мыслення, эстэтычнага ўспрымання, творчага стаўлення да тэмы ўрока.

Падчас пошуку шляхоў павышэння актыўнасці пазнавальнай дзейнасці важна ўлічваць фізіялагічныя працэсы. Чалавек пазнае навакольны свет з дапамогай усіх органаў пачуццяў, але асноўнымі каналамі атрымання інфармацыі з'яўляюцца зрокавы і слыхавы. "Сістэма «вуха-мозг» можа прапускаць за секунду да 50 біт інфармацыі. Прапускная здольнасць зрокавага аналізатара ў 100 разоў большая. Невыпадкова каля 90 % усіх звестак аб навакольным свеце вучань атрымлівае з дапамогай зроку, 9 % – з дапамогай слыху і толькі 1 % – з дапамогай дотыку" [1]. Чалавек, успрымаючы інфармацыю толькі слухаючы, запамінае каля 15 % звестак, толькі гледзячы – 25 % інфармацыі, а слухаючы і гледзячы – 65 % інфармацыі. Важна адзначыць і тое, што большасць сучасных школьнікаў запамінаюць і ўспрымаюць інфармацыю пераважна візуальна. Менавіта дадзены факт уплывае на тое, што прынцып нагляднасці набывае ўсё большае распаўсюджанне і паказвае сваю эфектыўнасць па прычыне таго, што ў аснове дадзенага прынцыпу ляжыць не толькі апора на зрок, але і на іншыя органы пачуццяў, выяўляецца неабходнасць пры выкарыстанні сродкаў нагляднасці фарміраваць у вучняў уяўленні і паняцці на аснове ўсіх пачуццёвых успрыманняў прадметаў і з'яў.

Адным з самых распаўсюджаных і папулярных прыёмаў візуалізацыі ў сучаснай школе з'яўляецца прыём "воблака слоў". "«Воблака слоў» – гэта форма візуалізацыі дадзеных, якая ўяўляе сабой набор ключавых слоў і словазлучэнняў, напісаных рознымі памерамі шрыфту і часам колеру" [3]. Па памеры слова і яго колеры можна вызначыць, якія словы з'яўляюцца галоўнымі і наколькі важнае кожнае слова. Раней дадзены метад прымяняўся толькі на асобных сайтах па прынцыпу гіперспасылак, але ў апошні час спосаб прымянення "воблака слоў" кардынальна змяніўся. Галоўнай зменай з'яўляецца тое, што зараз воблака слоў можна стварыць не толькі з гіперспасылак, але і проста са слоў або тэкстаў.

Для стварэння воблака слоў у інтэрнэце існуе вялікая колькасць спецыяльных рэсурсаў. Самымі папулярнымі з іх з'яўляюцца наступныя: wordcloud.online, wordscloud.pythonanywhere, wordart.com. Але для таго, каб зацікавіць вучняў і развіць іх творчыя здольнасці, настаўнік можа прапанаваць школьнікам самастойна стварыць воблака слоў па тэме. Пры вывучэнні асобных твораў беларускай літаратуры гэты метад дапаможа настаўніку зразумець, якія паняцці і моманты вучні палічылі самымі важнымі і на што звярнулі сваю ўвагу. Акрамя таго, воблака слоў можа дапамагчы вучням у працэсе запамінання біяграфіі аўтара. У гэтым выпадку настаўнік прапануе тэкст біяграфіі, а вучні самастойна выбіраюць самую важную інфармацыю і ператвараюць яе ў воблака. Пасля настаўнік павінен праверыць тое, што зрабілі вучні і адзначыць тыя важныя моманты, на якія вучні маглі не звярнуць увагу.

Акрамя самастойнага стварэння вучнямі воблака слоў, настаўнік можа арганізоўваць інтэрактывы з дапамогай дадзенага метаду. Адным з варыянтаў такога інтэрактыву з'яўляецца наступны. У канцы чвэрці або года настаўнік рыхтуе воблакі слоў, якія змяшчаюць асноўную інфармацыю пра пісьменнікаў і паэтаў, з якімі знаёміліся вучні, а затым школьнікі павінны адгадаць, звесткі пра каго змешчаны ў гэтым заданні. Ствараць такія воблакі

настаўнік можа не толькі па біяграфіях, але і па змесце твораў. Для гэтага ў воблаку павінна змяшчацца інфармацыя пра галоўных герояў твора, месцы, дзе адбываецца дзеянне, нейкія адметныя дэталі. Таксама воблакі могуць змяшчаць у сабе інфармацыю пра аднаго канкрэтнага героя, калі ён падрабязна і ярка прапісаны аўтарам. Напрыклад, пасля вывучэння твора Якуба Коласа "На ростанях" можна стварыць воблакі на аснове вобразаў Андрэя Лабановіча, Ядвісі, Алеся Садовіча і іншых, бо іх падрабязнае апісанне змешчана ў тэксце твора.

Пры вывучэнні лірыкі настаўнік можа прапанаваць вучням стварыць воблака слоў з мастацкіх сродкаў, якія ўжывае аўтар у творы, а пасля прэзентаваць тое, што атрымалася, і паралельна тлумачыць ролю кожнага сродку мастацкай выразнасці.

На ўроках беларускай мовы "воблака слоў" можна прымяняць пры вывучэнні характарыстык розных часцін мовы. Напрыклад, спачатку настаўнік тлумачыць новую тэму пра назоўнік, разам з класам ствараецца воблака слоў, якое змяшчае асноўныя характарыстыкі, словы для гэтага могуць быць наступнымі: *самастойны, прадмет, хто, што, род, лік, склон, дзейнік, выказнік, дапаўненне*. Такое воблака ствараецца на кожную часціну мовы. Пасля гэтага настаўнік можа раздаць вучням воблакі, у якіх будзе не хапаць некаторых характарыстык, а вучні павінны будуць іх узнавіць, або, напрыклад, узгадаць, для якой часціны мовы ўласцівы наступныя характарыстыкі. Гэты метад не толькі дапаможа актывізаваць вучняў падчас стварэння воблакаў, але і ўпарадкуе інфармацыю, зробіць яе больш цікавай і даступнай для запамінання.

Дадзены метад таксама можна выкарыстоўваць для вывучэння слоўнікавых слоў па пэўнай тэме або для запамінання пэўных лінгвістычных тэрмінаў.

Такім чынам, можна прыйсці да высновы, што выкарыстанне такога прыёму, як "воблака слоў", дапамагае не толькі зрабіць урокі больш цікавымі для вучняў, але і актывізуе іх увагу, вучыць знаходзіць у тэксце галоўную інфармацыю і выкарыстоўваць яе, развівае творчае і крытычнае мысленне школьнікаў, дапамагае сістэматызаваць і запоўніць атрыманыя веды. Менавіта гэтыя фактары і з'яўляюцца асноўнымі пры выбары і распрацоўцы новых прыёмаў і форм работы на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

**Літаратура**

1 Научный журнал «Успехи современного естествознания» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://natural-sciences.ru/ru/article/view?id=33111. – Дата доступа: 20.04.2024.

2 Інтэрактыўная гісторыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://sites.google.com/site/interaktivnaaistoria/home/vizualizacya. – Дата доступу: 20.04.2024.

3 Инфоурок [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://infourok.ru/primenenie-priyomov-vizualizacii-na-urokah-russkogo-yazyka-i-literatury-6061517.html. – Дата доступа: 20.04.2024.

**УДК 821.161.3-14*Н.Мацяш**

***А. М. Фелькіна***

## "КАХАЮ. І ЧАКАЮ": МАСТАЦКАЯ АДМЕТНАСЦЬ ІНТЫМНАЙ ЛІРЫКІ НІНЫ МАЦЯШ

*У артыкуле прааналізавана інтымная лірыка Н. Мацяш. Сцвярджаецца, што біяграфія паэткі моцна паўплывала на яе творчасць. Вершы Н. Мацяш выяўляюць душэўны і фізічны стан аўтаркі ў розныя перыяды творчасці, яе стаўленне да кахання і каханага, драму асабістага жыцця. Я-гераіня Н. Мацяш перажывае розныя адценні пачуцця кахання і пражывае розныя яго этапы.*